# Пачатак і заканчэнне Другой сусветнай вайны

Матэрыялы да ўроку

90 хвілін

Працоўны аркуш 2

## Назва тэкставай крыніцы (пры наяўнасці)

## A Апісанне тэкставай крыніцы

### ➔ аўтар / дата стварэння / прычына

Што вы ведаеце пра аўтара, яго/яе паходжанне, узрост і прафесію / грамадскае становішча, а таксама пра яго/яе светапогляд (палітычную арыентацыю, каштоўнасці)? Што вы ведаеце пра час стварэння тэкставай крыніцы і пра прычыны яе стварэння?

### ➔ тып крыніцы / адрасат

Да якога віду крыніц належыць дадзеная тэкставая крыніца? (Напрыклад, успаміны, ліст або данясенне, дзённік, газетны артыкул, хроніка, прамова, выступ і інш.) Каму быў адрасаваны гэты тэкст? Тэкставая крыніца даступная цалкам або прыведзеная ў выглядзе вытрымкі?

## ➔ тэма / змест / аргументацыя

Коратка апішыце тэму тэкставай крыніцы адным сказам, а затым зрабіце змест больш дакладным: пра што паведамляецца / што сцвярджаецца ў гэтым тэксце? Ці ёсць супярэчнасці ў аргументацыі?

## ➔ задума

Напрыканцы коратка апішыце задуму аўтара з улікам усіх папярэдніх этапаў.

## Б Разгляд тэкставай крыніцы ў гістарычным кантэксце

### ➔ Гістарычны кантэкст

Растлумачце гістарычны фон, змясціўшы крыніцу ў адпаведны гістарычны кантэкст. Гэты крок важны для таго, каб вы прааналізавалі задуму аўтара. Звяжыце ваша тлумачэнне фону і кантэксту з падзеямі да стварэння крыніцы, за выключэннем прагнозаў будучыні, зробленых аўтарам у крыніцы; у апошнім выпадку вы можаце вырашыць, меў аўтар рацыю або не. Адна крыніца часта ўтрымлівае некалькі сцвярджэнняў; такім чынам, іх варта аднесці да розных гістарычных кантэкстаў.

## В Ацэнка тэкставай крыніцы

Ацаніце тэкставую крыніцу. Не забывайцеся пра тое, што мы не можам судзіць думкі і дзеянні людзей, якія жылі ў мінулым, зыходзячы выключна з нормаў і стандартаў сучаснага грамадства. Узважана абгрунтуйце ваша рашэнне.

Выкажыце, калі ласка, асабістае стаўленне да абранай крыніцы, ацаніце яе.

## Г Якія пытанні застаюцца адкрытымі? Што новага вы даведаліся? Што было вам незразумела?